Горад

Сцягі або пажар? Ад чаго ратуюць горад пажарныя Гродна



З канца жніўня пажарныя машыны выязджаюць у горад амаль кожны дзе[illegible]. 4 верасня ратавальнікі працавалі ў Альшанцы, 7 верасня — на Таўлая, 10-

чырвона-белыя сцягі з будынкаў і будаўнічых канструкцый. «Пажарныя цяпер усюды, усё гарыць», — выказалася адна з мінакоў, назіраючы 13 верасня за работнікамі МНС на Курчатава. Hrodna.life сабраў выпадкі здымання гістарычных сцягоў у Гродне і паспрабаваў падлічыць, у колькі абыходзіцца праца ратавальнікаў.

З пачатку пратэстаў бел-чырвона-белыя сцягі сталі з'яўляцца ў вокнах, на балконах і дахах дамоў, і нават на гарадскіх сажалках. Белымі і чырвонымі стужачкамі жыхары абвязваюць дрэвы, агароджы і дарожныя знакі. Змагаюцца са стужачкамі работнікі ЖЭСаў і «свядомыя грамадзяне». А сцягі на будынках «прыраўнялі» да надзвычайных сітуацый. З імі змагаюцца пажарныя.

7 верасня на Таўлая на пажарную лесвіцу падняўся чалавек у цывільным і ў масцы. Даўжыні лесвіцы не хапала. Вечарам невядомыя зламалі замок на гарышчы і знялі сцяг праз дах.

13 верасня ў скверы Памяці воінаў-афганцаў па вуліцы Курчатава ў Гродне некалькі супрацоўнікаў МНС у суправаджэнні міліцыі здымалі з сярэдзіны сажалкі бел-чырвона-белы сцяг. Каб яго ліквідаваць, былі задзейнічаныя два аўтамабілі МНС і машына міліцыі. «Ратаваў» сцяг з сажалкі супрацоўнік у экіпіроўцы вадалаза, для гэтага ён выплыў у цэнтр сажалкі на лодцы са страхоўкай. Мясцовыя жыхары сабраліся паглядзець на аперацыю.

youtu.be/YyPZNppWV0I

Гадзіна працы вадалаза пры аказанні платных паслуг у Гродне каштуе 20 рублёў 28 капеек за ўдзел аднаго супрацоўніка.

Выкарыстанне паліва ў МАЗ (пажарнай аўтацыстэрны) на 1 км па горадзе складае

машыны. На 100 км выходзіць 12,5 літра дызельнага паліва. Дызельнае паліва цяпер каштуе 1 рубель 66 капеек за літр.

На территории «Гродно Азот» повесили бело-красно-белый флаг. Работники МЧС его сняли (обновлено)

«Гэта поўны абсурд, — абураўся Дзмітрый, мясцовы жыхар. — Калі столькі людзей занята нейкай лухтой, усе мінакі смяюцца, насельніцтва глядзіць. Калі прыязджаюць тры экіпажы з людзьмі, з кожнай машыны выходзіць па 3−4 чалавека: ім жа трэба заплаціць зарплату, заліць бензін. Адкуль усе гэтыя рэсурсы? Цырк».

Іншая мясцовая жыхарка з дзіцем, праходзячы міма, пажартавала: «Пажарныя цяпер усюды, усё гарыць».

Незвычайная праца не заканчваецца

Такая незвычайная праца для ратавальнікаў не сканчаецца. Сцягі працягваюць з’яўляцца і на вадаёмах, і на вышынях.

18 сентября плот с флагом появился на середине одного из затопленных карьеров в Пышках. Фото читателя

19 сентября, Юбилейное озеро. Кто-то просто оставил флаг на берегу

20 верасня, вечарам пасля традыцыйнай мірнай акцыі ў горадзе і затрыманняў на ёй, нехта спусціў на Нёман бел-чырвона-белы плыт са свечкамі.



Раніцай 21 верасня гродзенцаў сустракалі ўжо новыя сцягі на жылых дамах.

Флаг между домами Декабристов, 1 и Индустриальная, 1. Заметили флаг утром 21 сентября, около 9.30 его уже сняли с крыши 5-этажки. Очевидец написал, что, вероятно, снимали работники ЖЭС

21 сентября, один из домов в Гродно

«Хтосьці папрасіў штосьці зняць, мы і здымаем»

«Нашы работнікі, як заўсёды, выязджаюць на надзвычайныя сітуацыі для аказання дапамогі людзям, і прыцягваюцца для аказання дапамогі

міліцыі, і гэтак далей», — патлумачыла Hrodna.life прэс-сакратар Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС Наталля Жывалеўская.

Ці былі выклікі па зняцці сцягоў менавіта такім міжведамасным супрацоўніцтвам, яна не ведае.

«Такія выпадкі мы не лічым. Хтосьці папрасіў штосьці зняць, мы і здымаем», — удакладніла яна пазней на пытанне аб колькасці такіх выездаў. Наталля Жывалеўская адзначыла, што калі хто-небудзь з грамадзян патэлефануе ў службу выратавання з просьбай прыбраць сцяг, выклік перанакіруюць у міліцыю.

Белорусы получают СМС с просьбой сообщать о «незарегистрированной символике» в милицию. Что говорит оператор

У прэс-службе УУС Гродзенскай вобласці выезды выратавальнікаў па зняцці сімволікі абмяркоўваць з **Hrodna.life** адмовіліся. «Я не кампетэнтны каментаваць працу МНС», — сказаў прэс-сакратар УУС **Яўген Дудко**.

Прысутнасць міліцыі падчас зняцця сцяга з сажалкі на Курчатава ён таксама не стаў тлумачыць, спаслаўшыся на тое, што трэба шукаць інфармацыю па канкрэтным выпадку.

Хто аплачвае выклік і якім чынам

За выклік МНС для аказання дапамогі чалавеку, выратавання ката, ліквідацыі асінага гнязда ў вас пад акном асобна не плаціць ніхто. Гэта праца ратавальнікаў і

РАУС, напрыклад, ускрыцця дзвярэй, таксама аплачваюцца з бюджэту.

Калі ж здарыўся пажар, і высветлены вінаваты — ён аплачвае выдаткі пасля складання пратаколу і ацэнкі шкоды.

У выпадках ілжывых выклікаў, калі небяспекі ні для каго не было, міліцыя, следчыя высвятляюць асобу таго, хто тэлефанаваў. Таго, хто здзейсніў ілжывы выклік, прыцягваюць да адказнасці ў адпаведнасці з адміністрацыйным або крымінальным заканадаўствам.

Напрыклад, выезд на спрацоўванне сігналізацыі, калі па прыездзе нічога не гарэла, лічыцца ілжывым. Тады за прыезд пажарных падраздзяленняў і працу асабістага складу плаціць уласнік аб’екта. Такая плата складае каля 40 рублёў, у залежнасці ад таго, колькі часу было выдаткавана, распавяла **Hrodna.life** крыніца ў МНС.

8 верасня, на наступны дзень пасля «ліквідацыі» сцяга на Таўлая, туды прыйшла праверка з МНС. Пра гэта распавёў **Hrodna.life** жыхар дома. Прэтэнзіі былі да адсутнасці даводчыка на адных дзверах, да кветак, якія стаялі ў пад’ездзе, і да дзіцячага ровара каля закінутага смеццеправода. Старшыні таварыства ўласнікаў выпісалі штраф 29 базавых велічынь (783 рублі) як фізічнай асобе. Здымкамі дакументаў падзяліўся жыхар дома.

Так выглядаюць парушэнні:

Ратавальнікі - крайнія?

Ратавальнікі з МНС, паводле Статуту, абавязаны выязджаць на любы выклік, звязаны з ліквідацыяй надзвычайных сітуацый, пагрозай жыцця чалавека, дапамогай насельніцтву і на тактыка-спецыяльныя вучэнні і заняткі. Гэта тычыцца супрацоўнікаў усіх спецыяльнасцяў. Адлучацца з дзяжурства па любых пытаннях, акрамя выпадкаў, прадугледжаных Статутам, забаронена. Акрамя таго, начальнік гарнізона мае права аддаваць загады, абавязковыя да выканання — і службовым асобам, і асабоваму складу падраздзяленняў. Крыніца ў МНС распавяла **Hrodna.life**, што калі калегу адправілі здымаць сцяг, яго палохалі абвінавачваннем

- В Лиде прошел автопробег работников МЧС на машинах со скрытыми номерами
- Кто такие «тихари»? Как сотрудники таможни, прокуратуры, МЧС и Следственного комитета работали на выборах президента и протестах

У Мінску зарыентаваліся: у прадпісаннях таварыству ўласнікаў дома, на якім размясцілі вялікі сцяг, напісалі, што палотнішча парушае пажарную бяспеку будынка.

18 верасня пракуратура Мінска паведаміла, што тэрытарыяльныя падраздзяленні МНС 87 разоў выязджалі «для зняцця размешчаных на будынках канструкцый, не прадугледжаных праектнай дакументацыяй, якія парушалі архітэктурна-планіровачныя рашэнні і стваралі пагрозу бяспекі грамадзян». Гаворка ішла пра сцягі на дамах. 11 чалавек і 26 юрыдычных асоб прыцягнулі да адказнасці па арт.23.56 КаАП за невыкананне правілаў пажарнай бяспекі. З іх спаганяюць выдаткі на «аднаўленне супрацьпажарнай бяспекі».

Датэлефанавацца ў прэс-службу гродзенскай пракуратуры **Hrodna.life** не ўдалося.

«Символ новой чистой Беларуси». Невесты в бело-красно-белых платьях вышли на акцию в Гродно

РАНЕЙ
« Акупацыя ці вызваленне? Што было ў Гродне ў верасні 1939 года: успаміны сведкаў

ДАЛЕЙ
Дверь в студенческую жизнь. Как выучить язык за год и поступить в университет Польши »

МЕТКІ:

здарэнні / палітыка / Пратэсты ў Гродне / раім пачытаць / улады

21 ВЕРАСНЯ 2020 14:40

ПАДОБНЫЯ ЗАПІСЫ

Жывая музыка, шоу ілюзіяніста і караоке. Дзе ў Гродне сустрэць Новы год 2024 і правесці навагодні карпаратыў

«Ад двух да пятнаццаці. Мая мама ў турме». Псіхолаг Вольга Вялічка напісала кнігу пра свет, якім бачаць яго дзеці палітвязняў

Чароўныя краявіды, выпрабаванне бюракратыяй і словы, якія нагадваюць пра радзіму: беларуска расказала пра досвед эміграцыі ў Нарвегію

АПОШНІЯ ЗАПІСЫ

ЛЮДЗІ І СПРАВЫ

Варшавы напісалі палітзняволеным 3400 лістоў - які шлях яны праходзяць?

Беларусы Варшавы ўжо два гады амаль штотыдзень збіраюцца ў Беларускім моладзевым хабе і пішуць лісты…

13 снежня 2023

ЛЮДЗІ І СПРАВЫ

Чароўныя краявіды, выпрабаванне бюракратыяй і словы, якія нагадваюць пра радзіму: беларуска расказала пра досвед эміграцыі ў Нарвегію

Юля жыве ў Нарвегіі ўжо паўтара года. Гэта трэцяя краіна, у якую яе з 2021-га…

12 снежня 2023

КАРЫСНАЕ

Жывая музыка, шоу ілюзіяніста і караоке. Дзе ў Гродне сустрэць Новы год 2024 і правесці навагодні карпаратыў

У "Чэмпі" і "Гудзіні" на карпаратыў вы зможаце праспяваць караоке. У Soho можна будзе ўбачыць…

11 снежня 2023

ЛЮДЗІ І СПРАВЫ

«Ад двух да пятнаццаці. Мая мама ў турме». Псіхолаг Вольга Вялічка напісала кнігу пра свет, якім бачаць яго дзеці палітвязняў

За два гады, што псіхолаг Вольга Вялічка працуе з дзецьмі палітзняволеных, яна пачула каля сотні…

11 снежня 2023

СПАДЧЫНА

Якое на смак 200-гадовае віно? Пад Гроднам выпадкова знайшлі

Падчас рэканструкцыі палацава-паркавага комплекса ў Свяцку будаўнікі выпадкова знайшлі бутэлькі з 200-гадовым віном. Іх аддалі…

7 снежня 2023

ЛЮДЗІ І СПРАВЫ

Гродзенскае «Слова пацана». Як «шанхайскія» і «спартсмены» крышавалі рынак у Гродне

Серыял "Слова пацана" - гісторыя пра расійскія маладзёжныя банды 1980-х - стаў адной з самых…

7 снежня 2023

All Rights Reserved Перайсці на звычайную версію